Пролетарыі ўсіх краін, аднаўцеся!

ЗАРА

орган Брэсцкага абкома КП(б)Б і аблвыканкома

№ 163 (235) | Субота, 20 ліпеня 1940 г. | Цана 10 кап.

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Аб забароне самавольнага ўхода з работы трактарыстаў і камбайнераў, работаючых у машына-трактарных станцыях

У сувязі з шматлікімі просьбамі калгасаў і машына-трактарных станцый — Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР пастанаўляе:

1. Распаўсюдзіць на трактарыстаў, брыгадзіраў трактарных брыгад і іх памочнікаў, работаючых у машына-трактарных станцыях, дзеянне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня 1940 г. за выключэннем артыкулаў 1-га і 2-га, якія на ўказаныя катэгорыі работнікаў не распаўсюджваюцца ў сілу сезоннага характара сельскагаспадарчых работ.

На камбайнераў, як на штатных рабочых МТС, распаўсюдзіць Указ ад 26 чэрвеня 1940 года поўнасцю.

2. Даны Указ уваходзіць у сілу з 18 ліпеня 1940 года.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН

Масква, Крэмль. 17 ліпеня 1940 года.

Выпуск дрэннай прадукцыі—дзяржаўнае злачынства

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР „Аб адказнасці за выпуск нядобраякаснай альбо некамплектнай прадукцыі і за незахаванне абавязковых стандартаў прамысловымі прадпрыемствамі" з'яўляецца магутным рычагом далейшага ўздыму народнай гаспадаркі і ўмацавання абаронай магутнасці соцыялістычнай радзімы. Новы закон паложыць прадзел вырабу нядобраякаснай прадукцыі.

Пераважная большасць спецыялістаў, рабочых і служачых нашай краіны з вялікім вытворчым уздымам працуюць на карысць соцыялістычнай радзімы, даюць прадукцыю высокай якасці, адпавядаючую патрабаванням соцыялістычнай дзяржавы.

Вялікія страты ў народнай гаспадарцы наносілі і наносяць дэзарганізатары вытворчасці — летуны і прагульшчыкі. Новы закон аб працы, забараняючы самавольны ўход з работы рабочым і служачым з прадпрыемстваў, дае магчымасць стварыць на фабрыках і заводах, у прамысловых арцелях больш устойлівы кадры. Гэта выдатнае мерапрыемства разам з павелічэннем рабочага часу да 8 гадзін і пераходзе на 7-дзённы рабочы тыдзень — садзейнічае большаму выпуску прадукцыі і тавараў шырокага спажывання.

Але не ў меншай меры за прагульшчыкаў і летуноў на прадпрыемствах шкодзяць і бракаробы, па віне якіх выпускаецца нядобраякасная прадукцыя. А выраб нядобраякаснай, нестандартнай прадукцыі з'яўляецца злачынствам перад дзяржавай, з'яўляецца вынікам нядобрасумленных, злачынных адносін кіраўнікоў прадпрыемстваў да сваіх абавязкаў перад радзімай.

Вось чаму Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР „аб адказнасці за выпуск нядобраякаснай прадукцыі быў сустрэт працоўнымі з вялікім задавальненнем.

На Гайнаўскім лесапільным заводзе імені Варашылава на заўтра-ж пасля апублікавання Указа была склікана нарада адміністратыўна-гаспадарчага і тэхнічнага персанала завода. У святле Указа на нарадзе быў намечан цэлы шэраг каштоўных мерапрыемстваў, пасля ажыццяўлення якіх брак з шасці процантаў знізіўся да мінімума.

На заводзе павялічылі лік бракераў і сартыроўшчыкаў, прад'явілі да іх патрабаванні добрай прыёмкі прадукцыі, сталі патрабаваць ад майстроў лепшай якасці прадукцыі і, нарэшце, на заводзе праводзіцца ў жыццё дзейнічаючы закон, устаноўлены ўрадам, аб матэрыяльнай адказнасці бракаробаў.

На вялікі жаль, не ўсе кіраўнікі прадпрыемстваў абласці ўзяліся за правядзенне ў жыццё Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР. Відаць, дырэктар хлебакамбіната таварыш **Буглак** лічыць, што указ яго не датычыцца.

Не будзем галаслоўнымі, перайдзем да фактаў. 15 ліпеня дзяржаўным інспектарам гандлю была праведзена праверка якасці тавараў у гандлюючай сетцы горада. У часе праверкі выявілася, што амаль у кожным хлебным магазіне горада аказаўся нядобраякасны хлеб. У краме № 6 горхарчгандлю было знойдзена 200 кілаграм сырога, гарэлага, нестандартнага хлеба, які прадаваўся па звычайных цэнах. Гэты хлеб быў накіраван назад у пякарню № 2. Не гледзячы на гэта, 16 ліпеня з гэтай-жа пякарні ў магазіны горада зноў было накіравана 573 кілаграмы непрыгоднага, гарэлага хлеба.

А вось паспрабуйце знайсці віноўніка на хлебакамбінаце акрамя дырэктара! І вы не знойдзеце па вельмі простай прычыне. Хлеб тут не маркіруецца і невядома якая брыгада, змена, пякарня выпускае добрую або дрэнную прадукцыю. Дырэктар не можа спрасіць з брыгадзіраў, майстраў аб якасці, таму што не ведае, як гэтыя людзі працуюць.

Прадукцыю дрэннай якасці выпускаюць арцелі і прадпрыемствы мясцовай прамысловай кааперацыі. У пагоні за колькасцю быў дырэктар лесазавода „Чырвоная зара". Звераў пачаў выпускаць нядобраякасную прадукцыю. Лесазаводу была даручана вырабляць крэслы — новы від вырабу для завода. Не гледзячы на гэта, Звераў распарадзіўся аб масавай падрыхтоўцы частак для крэслаў, прычым адразу-ж была загатоўлена ножак больш, як на 2 тысячы крэслаў. Калі-ж пачалі зборку, дык аказалася, што многія часткі не адпавядаюць стандартам і непрыгодны. З 500 крэслаў 200 былі выбракаваны, а астатнія таксама невысокай якасці. Такім чынам дзесяткі тысяч рублёў дзяржаўных грошай з-за безгаспадарчасці дырэктара былі выкінуты на вецер.

Або вось другі выпадак. У Маларыцкай мэблёвай арцелі зараз перарабляюць тую мэблю, якую яны выпусцілі два месяцы таму назад, таму што пакупнік звярнуў яе ў арцель з-за нізкай якасці. Гэты абураючы факт не патрывожыў кіраўніцтва Абллесдрэўхімсаюза і раённыя арганізацыі.

Многа лепшага можна пажадаць у справе ўзняцця якасці выпускаемай прадукцыі шавецкімі і шорнымі арцелямі сістэмы Многапромсаюза. Абутак, шорныя вырабы выпускаюцца нізкай якасці, не адпавядаюць стандартам, ды і к таму-ж высокага сабекошту. У сістэме Многапромсаюза па-сапраўднаму не ўзяліся за павышэнне якасці прадукцыі. Тут толькі думаюць аб увядзенні маркіроўкі і бракіроўкі прадукцыі.

Дзяржаўныя прамысловыя прадпрыемствы і арцелі нашай абласці могуць і павінны даваць прадукцыю высокай якасці. Гэтага патрабуе наша дзяржава, патрабуе ўвесь савецкі народ. Партыйныя, савецкія і профсаюзныя арганізацыі павінны ўзяць пад свой штодзённы кантроль работу прадпрыемстваў і арцелей.

За выпуск добраякаснай прадукцыі, адпавядаючай стандартам, павінны змагацца ўсе, пачынаючы ад чорнарабочага і канчаючы камандзірамі вытворчасці. Рашучая барацьба з стратамі на вытворчасці, з бракам і выпускам нестандартнай прадукцыі, з'яўляецца важнейшай умовай паспяховага выканання плана трэцяй сталінскай пяцігодкі.

Дэманстрацыя працоўных г. Рыгі, прысвечаная выбарам у сейм. Фота Рэгана. (Фотахроніка Белта).

Дружная работа на ўборцы

Шэрашава. З усходам сонца на калгасных палях становіцца людна, ажыўлёна. Радасна і дружна кіпіць работа. Усе 6 калгасаў раёна падрыхтаваны прыступілі да ўборкі. Усюды правільна расстаўлена рабочая сіла, індыўдуальная здольнасць рашае тэмпы і якасць работ. Услед за жняркамі арганізавана зграбанне калосся ў звязка снапоў. Калгаснікі змагаюцца за тое, каб ні адзін колас не застаўся на полі. Ва ўсіх калгасах ужо ўбрана 50 процантаў азімых.

Правільнай арганізацыі і высокай прадукцыйнасці працы спрыяе добра пастаўленая агітацыйна-масавая работа ў полі. У калгасе імені Сталіна ва ўсіх брыгадах вылучаны агітатары з ліку комсамольцаў і перадавой несаюзнай моладзі. Агітатары растлумачваюць калгаснікам рашэнні апошняга Пленума ЦК КП(б)Б, праводзяць гутаркі, чытаюць газеты.

Добрым агітатарам у брыгадзе зарэкамендавала сябе маладая комсамолка з комсамольскага маладзёжнага звяна Рабчук Маня. Яна талкова і даходчыва растлумачвае калгаснікам рашэнні Пленума ЦК КП(б)Б і іншыя пытанні. Рабчук арганізавала сістэматычны выпуск брыгаднай газеты. Газета паказвае вопыт лепшых калгаснікаў на ўборцы, якія перавыконваюць дзённыя нормы, рашуча крытыкуе тых, хто работае з прахладцам. Такімі, напрыклад, аказаліся калгаснікі Венскі і Бентнік. Газета не ўпусціла гэты факт і паказала, як яны ў рэзультаце слаблення на работу не выконваюць норм выпрацоўкі.

На ўборцы шырока разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва. У рэзультаце многія калгаснікі, як Мікуліна Арына, Пільчук Шура і іншыя, пры норме 0,08 гектара, жнуюць у дзень па 0,15—0,15 гектара. Калгасу трэба ўбраць 110 гектараў азімых, з якіх палова ўжо зжата.

Усяго па раёну зжата 35 процантаў азімых. Добра праводзіць уборку і аднаасобны сектар. У радзе сельскіх саветаў аднаасобнікі ўжо зжалі 50 процантаў жыта. Бядняцкім гаспадаркам, якія не маюць коней, арганізавана соцыялістычная дапамога.

Р. Каралёў.

Зжалі 2055 гектараў азімага жыта

Паспяхова закончыўшы сенаўборку, калгаснікі і аднаасобнікі Кобрынскага раёна дружна прыступілі да масавай уборкі жыта.

За тры дні ў вёсках Турна, Быстрыца і Вялікія Прылукі, Турнянскага сельсавета, зжата 125 гектараў азімых.

Весела радасна праходзіць жніво ў калгасе імені Варашылава, Батчэнскага сельсавета. Калгаснікі і аднаасобнікі з вялікім захапленнем цікавіліся работай на калгасных палях жняярак-самаскідак.

За два дні ў калгасе зжата 40 гектараў жыта. Сельскагаспадарчая арцель на час уборачных работ забяспечана косамі, сярпамі, неабходнымі сельскагаспадарчымі машынамі.

Добра падрыхтаваўся да ўборкі ўраджаю і калгас імені Сталіна, Пасхаўскага сельсавета. Тут да пачатку ўборкі поўнасцю былі адрамантаваны 2 жняркі, 2-е конных грабель, веялкі і астатні ўборачны інвентар.

Па калгасах Кобрынскага раёна зжата 60 га жыта, а па аднаасобнаму сектару—1995 гектараў.

Ермолаеў.

Арганізавана вышлі на ўборку

Ва ўсіх сельсаветах Косаўскага раёна праводзіцца масавая ўборка жыта.

У вёсцы Сенькевічы зжата ўжо 50 гектараў, Азярц—35 га і Кушнярах—30 га.

У калгасе „Коміцтэрн", Яглевіцкага сельсавета, на жніве работаюць 2 жняркі. Для абслугоўвання жняярак замацавана 12 коней і звяно мужчын.

На ўборачных работах у калгасе шырока разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва. Калгаснікі ўзялі абавязацельствы—у тэрмін і без страты правесці ўборку ўраджаю і першымі ў раёне выканаць абавязковыя пастаўкі.

Раённым спажывецкім саюзам завезена да ўборачнай кампаніі ў вёскі і калгасы 1500 кос, 450 сярпоў, брускі, гаспадарчае мыла і іншыя прадметы спажывання.

Гурткі варашылаўскіх коннікаў у калгасах

Па прыкладу калгаснай моладзі ўсходніх абласцей, у некаторых калгасах нашай вобласці шырыцца выдатны рух сярод маладых комсамольцаў і калгаснай моладзі за авалодванне кавалерыйскай справай, арганізацыю пры калгасах гурткоў „Варашылаўскіх коннікаў".

Першымі гэтую выдатную ініцыятыву падняла моладзь калгасаў „1 мая" і „Большэвік" Пружанскага раёна. У калгасе „1 Мая" ужо створан гурток „Варашылаўскіх коннікаў" у колькасці 21 чалавека. У калгасе „Большэвік" гурток складаецца з 16 чалавек. Праўленне абоіх калгасаў вылучыла для гэтых гурткоў па трое лепшых коней. Кіраўнікамі гурткоў з'яўляюцца вопытныя коннікі.

Таксама арганізаван у колькасці 13 чалавек і пачаў заняткі гурток „Варашылаўскіх коннікаў" у калгасе імені Леніна, Поразаўскага сельскага совета. З вялікім інтарэсам і захапленнем імкнецца моладзь авалодаць майстэрствам верхавой язды, рубкай, перамаганнем перашкод, джыгітоўкай і г. д. У гэтым калгасе гурткам кіруе старшыня сельскага совета тав. Серада, вопытны кавалерыст.

Такія-ж гурткі „Варашылаўскіх коннікаў" арганізуюцца зараз у Высокаўскім і Дывінскім раёнах.

Р. К.

У мястэчку Унгені

УНГЕНІ, 18 ліпеня (ТАСС). Штодзённа ў выканаўчы камітэт сцякаюцца натоўпы людзей і тут абгаварваюцца апошнія навіны. Даведаўшыся, што Соўнарком СССР і Цэнтральны Камітэт комуністычнай партыі падтрымалі прапанову аб стварэнні Саюзнай Малдаўскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, жыхары прыходзяць у выканком і просяць склікаць мітынг. Усе разумеюць, што пасля прыхода Чырвонай Арміі ніхто не пасмее забараніць весці гутарку аб будучай дзяржаўнасці Бесарабіі. Усяго тры тыдні назад за такі разгавор шэф паліцыі накіраваў-бы сабраўшыхся ў турму. Цяпер іншая справа. Цяпер не трэба плаціць 144 мільёны лей наследнікам пана Глаўчэ.

Гісторыя аб гэтых мільёнах не сходзіць з вуснаў жы[illegible] мястэчка. Землі, з якіх разраслося мястэчка, належалі памешчыку Глаўчэ. Лоўкі прайдоха здаваў участкі зямлі ў арэнду, але трэбаваў, каб усё пабудаванае на ўчастках праз 50 гадоў перайшло ў яго ўласнасць. Пасля смерці Глаўчэ суд прыгаварыў насельніцтва мястэчка да выплаты наследнікам Глаўчэ 144 мільёнаў лей.

Вызваленне Бесарабіі пазбавіла насельніцтва ад выплаты несправядлівай і неслыхана буйнай сумы. Жыхары Унгені ўзбадзёрыліся духам. З кожным днём мо[illegible] застаецца беспрацоўных, у гэтым годзе дзеці пойдуць у школу і будуць навучацца бясплатна. Выканком арганізуе бесперабойнае снабжэнне насельніцтва прадуктамі, аказваецца бясплатная медыцынская дапамога хворым, створ[illegible] міліцыі.

Фелікс Дзержынскі

Фелікс Эдмундавіч Дзержынскі быў адным з лепшых кіраўнікоў і байцоў большэвіцкай партыі.

Дзержынскі нарадзіўся ў 1877 годзе ў сям'і дробнага памешчыка-паляка. Ён вучыўся ў Віленскай гімназіі. Яшчэ 17-гадовым юнаком Фелікс Дзержынскі ўступіў на царысты шлях рэвалюцыянера і да апошняй гадзіны жыцця не зыходзіў з яго.

У вучэнні Маркса юны Дзержынскі знайшоў адказы на хваляваўшыя яго пытанні, як выратаваць працоўны народ ад эксплаатацыі, ад няроўнасці, ад усіх цяжараў і пакут, якія нясе капіталізм. Дзержынскі страсна вывучаў марксізм і нёс слова рэвалюцыйнай праўды ў масы рабочых і рамеснікаў, сярод якіх ён вёў падпольную работу. Яму было толькі 20 год, калі ён у Коўна арганізаваў забастоўку рабочых.

У 1898 годзе царскі ўрад выслаў Дзержынскага на поўнач Расіі, у Вяцкую губерню. Але ўжо ў наступным годзе Дзержынскі на лодцы ўцёк з ссылкі і вярнуўся на партыйную работу ў Вільна. Жандары хутка высляцілі яго, зноў арыштавалі і, пратрымаўшы ў турме, выслалі ва Усходнюю Сібір. Але Дзержынскі, не даехаўшы нават да месца ссылкі, уцёк, некаторы час жыў заграніцай, каб час ад часу прыязджаць у Польшчу для нелегальнай партыйнай работы.

У студзені 1905 года Дзержынскі вярнуўся ў Польшчу і вёў кіруючую работу ў соцыял-дэмакратычнай партыі Польшчы і Літвы, якая была арганізавана па яго ініцыятыве і пры яго ўдзеле. На з'ездзе Расійскай соцыял-дэмакратычнай рабочай партыі ў 1906 годзе Дзержынскага выбралі ў Цэнтральны Камітэт як прадстаўніка соцыял-дэмакратыі Польшчы і Літвы.

Арышты, турма, ссылка і пабегі часова перарывалі пастоянную дзейнасць Дзержынскага. Але кожны раз пасля выхада з турмы ці пасля пабега з ссылкі ён зноў акунаўся ў рэвалюцыйную работу.

Царскі ўрад пасля кожнага новага арышту Дзержынскага па вялічэнні рэпрэсіі. Ён перажыў і катаргу ў самай страшнай з царскіх турмаў — ў Орлоўскім Централе — і нявыносны рэжым дзесятага павільёна Варшаўскай цытадэлі.

Калі пад ударамі рабочага класа ў 1917 годзе рухнула самаўладства, Дзержынскі быў, нарэшце, вызвалены з турмы.

У Петраградзе пад непасрэдным кіраўніцтвам Леніна і Сталіна Дзержынскі вядзе пастоянную работу сярод сялян і салдат. У кастрычніку 1917 года Дзержынскі — член Ваенна-Рэвалюцыйнага Камітэта, кіраваўшага Кастрычніцкім узброеным паўстаннем.

Пролетарская рэвалюцыя перамагла, але вораг не здаўся. Памешчыкі, капіталісты, царскае афіцэрства паўсталі супроць улады рабочых і сялян. Белагвардзейскія арміі сумесна з полчышчамі інтэрвентаў павялі наступленне на маладую Совецкую рэспубліку. Вялікія надзеі ворагі ўскладалі на контрэвалюцыю, якая прытаілася ў тылу і спрабавала тут нанесці совецкай уладзе ўдар у спіну. Ворагі захваляліся на жыццё правадыроў партыі, забівалі яе адданых сыноў, арганізоўвалі контрэвалюцыйныя змовы і паўстанні, сабаціравалі работу ў маладых совецкіх арганізацыях.

Для абароны рэвалюцыі ад ворагаў была створана ВЧК — Усесаюзная Надзвычайная Камісія па барацьбе з контрэвалюцыяй, спекуляцыяй і сабатажам. На ўдары контрэвалюцыі ВЧК павінна была адказаць, як гаварыў Ленін, „рэпрэсіяй, бязлітасная, хуткай, неадкладнай, апіраючайся на спачуванне рабочых і сялян."

На пасту старшыні ВЧК патрэбны быў чалавек, готовы заўсёды аддаць сваё жыццё за шчасце людзей, чалавек жалезнай волі, які разумее неабходнасць знішчэння дзесяткаў і соцен ворагаў для выратавання мільёнаў працоўных. Такім чалавекам быў Дзержынскі. Яго партыя і выбрала.

Не ведаючы адпачынку, Дзержынскі стальной рукой адбіваў удары ворагаў рэвалюцыі, якія сыпаліся ў тую пару на маладую Совецкую краіну. Ён не спаў начамі, ён педаедаў, ён быў пастомным і бязлітасным у барацьбе з контрэвалюцыянерамі, якія імкнуліся ўзарваць совецкую ўладу і зноў аддаць рабочых і сялян у кабалу да капіталістаў і памешчыкаў.

Партыя даверала Феліксу Дзержынскаму самыя адказныя пасты.

Калі ў 1918 годзе Калчак прарваў усходні фронт пад Перм'ю, Ленін накіраваў на фронт таварышоў Сталіна і Дзержынскага, і становішча было выпраўлена.

Калі белапалякі пачалі вайну супроць Совецкай краіны, Дзержынскі, як выдатны дзеяч польскага рэвалюцыйнага руху, увайшоў у састаў Часовага Польскага Ваенна-Рэвалюцыйнага Камітэта.

Пасля зваротa з польскага фронта ён быў назначан на пост народнага камісара шляхоў зносін. Гэта было цяжкае заданне. Троцкі, які быў перад ім на гэтым пасту, давёў транспарт Совецкай краіны амаль да гібелі. Дзержынскі з уласцівай яму энергіяй узяўся за справу, і транспарт быў паладжан.

Дзержынскі быў строгі і патрабавальны да сябе і да другіх. Але патрабуючы работы і адказнасці, ён за кожным работнікам бачыў жывога чалавека. Увагай да чалавека, клопатамі аб ім, — тое, да чаго вялікі Сталін абавязвае кожнага партыйца, кожнага сапраўднага совецкага грамадзяніна, — гэтым была прасякнута ўся дзейнасць Дзержынскага, на якім пасту ён бы ні працаваў.

У 1924 годзе таварыш Дзержынскі быў назначан старшынёй Вышэйшага Совета Народнай Гаспадаркі СССР. На яго была ўскладзена велізарная работа па аднаўленню народнай гаспадаркі краіны. І Дзержынскі зноў блискуча справіўся з адказным заданнем. Глыбока даравіты чалавек, высока адукаваны, умеючы унікаць у самыя тонкія і, здавалася-б, вузка-спецыяльныя пытанні, Дзержынскі вывучыў нужды прамысловасці і сумеў хутка ўзняць яе.

Каб уявіць сабе, якой каласальнай працаздольнасцю валодаў Дзержынскі, напомнім, што і тады, калі ён быў народным камісарам шляхоў зносін, і тады, калі партыя паслала яго ў Вышэйшы Совет Народнай Гаспадаркі, ён прадаўжаў заставацца старшынёй ВЧК(ОГПУ).

Рабочыя горача любілі Дзержынскага. Ён быў да канца адданы справе партыі Леніна-Сталіна. Ён востра ненавідзеў ворагаў большэвізма. І калі хто-небудзь узнімаў руку на ленінскія запаветы, Дзержынскі быў да яго бязлітасным.

20 ліпеня 1926 года, за некалькі гадзін да смерці, Дзержынскі выступіў на Пленуме ЦК партыі большэвікоў з палкай прамовай, накіраванай супроць Троцкага, Зіноўева, Каменева, Пятакова і іншых здраднікаў.

Прыціхшая зала з незвычайнай увагай слухала страсную прамову саратніка Леніна і Сталіна. Нікому і ў галаву не прыходзіла, што гэта апошняя прамова Дзержынскага.

Сэрца, стомленае гадамі барацьбы, не вытрымала. Прышоўшы дамоў пасля пасяджэння, Дзержынскі скалчаўся ад разрыва сэрца.

Таварыш Сталін, развітваючыся з ім гаварыў:

„Калі цяпер, ля раскрытай труны, успамінаеш увесь пройдзены шлях Дзержынскага — турмы, катаргу, ссылку, Надзвычайную Камісію па барацьбе з контрэвалюцыяй, аднаўленне разбуранага транспарта, будаўніцтва маладой соцыялістычнай прамысловасці, — хочацца адным словам ахарактарызаваць гэтае кіпучае жыццё: **гарэнне. Гарэнне і геройская адвага ў барацьбе з цяжкасцямі**".

Чалавецтва доўгія гады будзе ўшаноўваць памяць Фелікса Дзержынскага.

Фелікс Кон.

ПАВЕДАМЛЕННЕ.

24 ліпеня 1940 года, ў 7 гадзін вечара, ў Доме партасветы склікаецца сход кандыдатаў партыі сумесна з сакратарамі первічных партарганізацый.

Яўка ўсіх абавязкова.

БРЭСЦКІ ГК КП(б)Б.

Пажніўнае лушчэнне стэрні

Барацьба за высокі ўраджай сельскагаспадарчых культур з'яўляецца асноўнай задачай у соцыялістычнай сельскай гаспадарцы. Смяцёвая расліннасць на палях — гэта вораг культурных раслін. Мінулае лета паказала, што палі некаторых абласцей вельмі моцна заражаны рознага рода смяцёвымі травамі, у першую чаргу свірэпцай, пырнікам і асотам.

Праполка сельска-гаспадарчых культур ад пустазелля была праведзена далёка недастаткова, асабліва ў аднаасобных гаспадарках, бо ў большасці выпадкаў абмежаваліся праполкай ільну і ярамы і шаніцы. Пустазелле ў астатніх культурах засталося развівацца і абсямяняць глебу. На будучы год яно зноў, у яшчэ большай ступені, будзе засмечваць палі і зніжаць ураджай сельскагаспадарчых культур.

Адным з самых эфектных мерапрыемстваў у барацьбе з смяцёвай расліннасцю, акрамя праполкі і ачысткі насення, з'яўляецца лушчэнне стэрні (пожні). Лушчэнне стэрні — абавязковая ўмова правільнай апрацоўкі глебы і праводзіцца перад успашкай на ворыва.

Задача лушчэння — выклікаць хутчэйшае прарастанне насення пустазелля з павярховых слаёў глебы, каб за тым знішчыць яго паглыбленым глыбокім ворывам на зяблеву. Пераважная большасць смяцёвых траў звычайна паспяваюць разам, а то і раней культурных раслін. Насенне смяцёвых траў, асыпаўшыся, попадае на паверхню глебы, прарастае і засмечвае пасевы.

Каб пазбегнуць засмечання палёў, неабходна асыпаўшаеся на паверхню глебы насенне смяцёвых траў прымусіць прарасці ўжо ў канцы лета, з тым, каб всходы пустазелля знішчыць пры зяблевым ворыве. А гэта дасягаецца лушчэннем, якое трэба праводзіць або з адначасовым правядзеннем уборкі зернавых культур або непасрэдна ўслед за ўборкай. Лепш вытвараць лушчэнне адначасова з правядзеннем уборкі, каб пазбегнуць дзіць быстрае высыхание глебы, якое ў сваю чаргу можа замарудзіць прарастанне пустазелля.

Але каб недапусціць страт ураджаю пры лушчэнні неабходна ўкладваць стараннае зграбанне і падбор калосоў неадкладна пасля жніва.

Наменшае значэнне, чым тэрміны, мае глыбіня лушчэння. Па навуковых даных і вопытах перадавікоў сельскай гаспадаркі вядома, што большасць насення смяцёвых траў прарастае на глыбіні 4—5 сантыметраў. Пагэтаму лушчэнне трэба праводзіць на гэтую глыбіню. Больш глыбокае лушчэнне заворвае насенне пустазелля настолькі глыбока, што яно не паспявае прарасці да моманту зяблівага ворыва, а гэта значыць не можа быць знішчана. Глыбокае лушчэнне не дае карысці.

Лепшым сродкам для лушчэння служаць дыскавыя лушчыльнікі (пшанічны плуг), але паколькі яны ў абласці пакуль-што адсутнічаюць, лушчэнне неабходна праводзіць дыскавымі баронамі. Яны маюцца амаль ва ўсіх машына-трактарных станцыях.

Лушчэннем і паследуючым зяблівым ворывам мы дасягаем таго, што на палях значна зменшаецца колькасць пустазелля, а гэтым самым павялічваецца ўраджай мінімум на 20—25 процантаў. Акрамя гэтага, лушчэннем мы захоўваем у глебе вільгаць і знішчаем ачагі залягання шкодных казюлек, да якіх адносяцца з мух: швецкая, гесенская, зялёнаглазка; з мятлікоў: сцеблевая, яравая і зернавая соўкі, лугавы мятлік; з перапончатакрылых: пілільшчыкі; з жучкоў: хлебны ўсач, хлебны жук, крестаносец, хлебная жужэліца, шчалкун і некаторыя трысы.

Акрамя шкодных казюлек пры лушчэнні многа гіне спор хваробатворных грыбкоў, напрыклад, спарынні, іржаўчыны і інш., якія прыносяць шмат шкоды культурным раслінам. Усё гэта гаворыць за тое, што лушчэнне як адзін з важнейшых агратэхнічных прыёмаў у барацьбе за высокі ўраджай трэба шырока і рашуча прымяняць як у соўгасах і калгасах, так і ў аднаасобных сялянскіх гаспадарках.

У гэтым калгасам і сялянскім бядняцкім і серадняцкім гаспадаркам павінны аказаць дапамогу машына-трактарныя станцыі. Даведзены план па лушчэнню стэрні неабходна выканаць у найбольш кароткія тэрміны.

Аграном **І. С. Казак.**

Клопаты аб мацяры і дзецях

27 чэрвеня 1936 года выйшаў у свет закон совецкага ўрада аб забароне абортаў, павялічэнні матэрыяльнай дапамогі рожаніцам, усталяванні дзяржаўнай дапамогі многадзетным, пашырэнні сеткі радзільных дамоў, дзіцячых ясляў, самога аб барацьбе з неплацельшчыкамі аліментаў.

Гэты закон ёсць праяўленне ленінскіх клопатаў партыі і ўрада аб рожаніцы і многасямейнай мацеры. Ён накіраван на выхаванне здаровага падрастаючага пакалення.

На аснове гэтага закона наша дзяржава штогодна выплачвае многадзетным мацерам сотні мільёнаў рублёў дапамогі.

Закон аб выдачы дапамогі многадзетным мацярам з першага студзеня г.г. распаўсюджан і на заходнія вобласці БССР. Прэзідыум Брэсцкага горвыканкома сваім рашэннем ад 11 ліпеня назначыў дапамогу па многадзетнасці мацярам: Андрэлевіч Сцепанідзе Міхайлаўне, Піво Еха Абрамаўне, па 2000 рублёў кожнай.

Лебедзеў.

Набылі племяннога жарабца—вытворніка

Калгаснікі калгаса „Зара", Бярозаўскага раёна, вялікую ўвагу звяртаюць на паляпшанне пароднасці конскага пагалоўя. У былой панскай Польшчы на ўсю вёску не было добрага жарабца-вытворніка. Дзякуючы калгаснай гаспадарцы, калгаснікі набылі племяннога жарабца за 3 тысячы рублёў.

В. Чэпко.

РАДЫЁПЕРАДАЧА З ЛОНДАНА

(Прынята на слух 18 ліпеня ў 19 гадзін)

ВЫСТУПЛЕННЕ ЧЭРЧЫЛЯ

Сёння ў палаце абшчын выступіў прэм'ер-міністр англійскага ўрада Чэрчыль з заявай аб англа-японскім пагадненні аб закрыцці дарогі Бірма — Кітай. Англійскі ўрад, заявіў Чэрчыль, заўсёды заяўляў і паўтарае зараз, што ён жадае бачыць Кітай свабодным. Разам з тым англійскі ўрад заўсёды імкнуўся да паляпшэння адносін з Японіяй. Англія не жадае ўступаць у канфлікт ні з адной з дальнеўсходніх краін. Пасля заключэння міру паміж Кітаем і Японіяй, які англійскі ўрад будзе вітаць, Англія перагледзіць пытанне аб сваіх канцэсіях і другіх правах і інтарэсах ў Кітаі. Асноўным метадам развязання палітычных пытанняў Англія лічыць метад мірных перагавораў.

Далей Чэрчыль агалосіў тэкст англа-японскага пагаднення. Хор Беліша запытаў прэм'ера, ці кансультаваўся англійскі ўрад па гэтаму пытанню з ЗША і СССР.

„Вядома,—адказаў Чэрчыль, — думка гэтых двух важнейшых дзяржаў была прынята пад увагу".

Заўвага ТАСС: ТАСС упаўнаважан паведаміць, што ссылка прэм'ера Вялікабрытаніі п. Чэрчыля на кансультацыі з СССР па пытанню аб англа-японскім пагадненні змяшчае недакладнасць. На самай справе англійскі ўрад не пытаў ні думкі, ні парады ўрада СССР па паказанаму пытанню, гэта значыць ён не кансультаваўся з ім, чаго ён і не абавязан рабіць па існуючых адносінах паміж Вялікабрытаніяй і СССР. Тое, што сапраўды мела месца, састаіць у тым, што намеснік міністра замежных спраў Вялікабрытаніі п. Батлер інфарміраваў паўпрэда СССР у Лондане Майскага аб рашэнні ўрада Англіі заключыць пагадненне з японцамі аб закрыцці дарогі Бірма-Кітай.

Двухсоттысячная дэманстрацыя працоўных Рыгі

РЫГА, 18 ліпеня (ТАСС). Сёння пасля сканчэння работы працоўныя латвійскай сталіцы вышлі на вуліцу прадэманстрыраваць бліскучую перамогу блока працоўнага народа, атрыманую на выбарах у народны сейм, любоў і адданасць латвійскага народа Совецкаму Саюзу, вялікаму Сталіну. Каля 200 тысяч металістаў, ткачоў, скурнікаў, чыгуначнікаў, рамеснікаў, служачых, салдат рыжскага гарнізона ўдзельнічала ў дэманстрацыі.

Калоны рабочых і служачых заводаў з усіх канцоў горада ішлі на плошчу да будынка ўрада. Уперадзе калон — партрэты таварышоў Сталіна, Молатава, Варашылава. На велізарных палотнішчах народ начартаў овае патрабаванні: „Просім далучыць нас да Совецкага Саюза!", „Дайце нам Сталінскую Канстытуцыю!", „Няхай жывуць Советы Латвіі!", „Няхай жыве сапраўды народны сейм!", „Няхай жыве правадыр народаў усяго свету вялікі Сталін!".

З балкона дома ўрада дэманстрантаў віталі прэм'ер-міністр Латвійскай рэспублікі прафесар Кірхенштэйнс, сакратар Цэнтральнага Камітэта комуністычнай партыі Латвіі Спурэ і другія. Прамоўцы гаварылі аб сіле латвійскага народа, яго несакрушальным жаданні жыць свабодна, мацаваць цесную брацкую дружбу з народамі СССР.

Пачынаецца грандыёзнае шэсце. Дэманстранты спяваюць Інтэрнацыянал. Раздаюцца прывітанні ў чэсць Совецкага Саюза, доблеснай Чырвонай Арміі, таварышоў Сталіна, Молатава, Варашылава.

Да позняй ночы прадаўжалася грандыёзная хвалюючая дэманстрацыя свабоднага латвійскага народа.

Трыумф літоўскага народа

КАУНАС, 18 ліпеня (ТАСС). Газеты адзначаюць скончыўшыяся выбары ў сейм як трыумфальную перамогу працоўных. Газета „Дарбо Лietува" піша: „Перамога працоўных на выбарах дэманстрыруе незвычайную прывязанасць народа Літвы да Совецкага Саюза, яго любоў да радзімы працоўных усяго свету і падзяку нашым вызваліцелям ад іга плутакратыі. З надзеяй і давер'ем глядзіць народ нашай краіны на магутны і вялікі Совецкі Саюз і ён поўны рашучасці следаваць вялікаму гістарычнаму прыкладу, які дала краіна соцыялізма ўсім народам. Літоўскі народ ясна паказаў, што жадае свой лёс звязаць з свабодным і шчаслівым народам Совецкага Саюза і будаваць жыццё новай Літвы ў брацкім саюзе з усім многанацыянальным народам краіны Советаў".

Канчатковыя даныя аб выніках галасавання ў Латвіі

РЫГА, 18 ліпеня (ТАСС). Цэнтральная выбарчая камісія па выбарах у латвійскі сейм апублікавала канчатковыя даныя аб ліку выбаршчыкаў, галасаваўшых за кандыдатаў групы „Саюз працоўнага народа Латвіі".

Усяго ў краіне за кандыдатаў групы галасавала 1.155.807 выбаршчыкаў.

Састаў дзяржаўнай думы Эстоніі

ТАЛІН, 18 ліпеня (ТАСС). У саставе новай дзяржаўнай думы Эстоніі 36 рабочых, 9 сялян, 5 настаўнікаў, 2 журналісты, адзін студэнт, адзін эканаміст і 21 служачы.

У ліку дэпутатаў 76 мужчын і 4 жанчыны. У папярэдняй думе жанчын не было.

Зводка германскага камандвання

БЕРЛІН, 18 ліпеня (ТАСС). У зводцы вярхоўнага камандвання гаворыцца: „Германскія ваенныя караблі ў акіянскіх водах патапілі гандлёвыя параходы праціўніка тапажам у 30 тысяч тон. Германскія войскі высадзіліся на востраве Уэсан, размешчаным перад Брэтаніяю.

Наша авіяцыя бамбардыравала ваенныя лагеры ў Олдэршоце, аэрадромы, заводы і порты Цэнтральнай і Паўднёвай Англіі. Заўважаны буйныя пажарыны аэрадроме Уэльс, на заводах Істборна, у партуПортленда. Буйны ваенны завод у Грынок пацярпеў ад прамых попаданняў бомб. У праліве Ла-Манш згарэў гандлёвы параход праціўніка. Другі параход і згаражавое судно атрымалі сур'ёзныя пашкоджанні, каманды пакінулі караблі.

Непрыяцельскія самалёты праніклі ноччу ў Рэйнскі і Рурскі раёны, але былі адагнаны зенітнай артылерыяй. Адзін непрыяцельскі самалёт збіт. Адзін германскі самалёт упаў у Ла-Манш.

Зводка італьянскага камандвання

РЫМ, 18 ліпеня (ТАСС). У зводцы італьянскага камандвання гаворыцца, што ва Усходняй Афрыцы нашы наземныя сілы і авіяцыя праследвалі праціўніка, адступіўшага ад Маяле ў напрамку Буна (Кенія). Захоплена зброя, боеприпасы і грузавікі.

Праціўнік з беспасяхова бамбардыраваў аэрадром Агордата (Эрытрэя). Адзін англійскі самалёт збіт.

Налёты германскіх самалётаў на Англію

ЛОНДАН, 18 ліпеня (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што германскія самалёты двойчы рабілі налёты на паўднёва-заходнія раёны Англіі.

У ноч на 18 ліпеня наглядалася актыўнасць германскай авіяцыі над Паўднёва-Усходняй і Паўднёва-Заходняй Англіяй, а таксама над Уэльсам. Пашкоджанні нязначныя. Сярод насельніцтва некалькі раненых.

Павелічэнне арміі Эйре

ЛОНДАН, 18 ліпеня (ТАСС). Газета „Таймс" паведамляе, што на працягу 6 тыдняў у армію Эйрэ завербавана 120 тысяч рэкрутаў.

Заява генерала Франко

НЬЮ-ЙОРК, 18 ліпеня (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Асошыэйтед Прэс, генерал Франко заявіў, што „абавязак і місія яго рэжыму — рэалізацыя спробы каралевы Ізабелы захапіць Гібралтар, экспансія ў Афрыцы, захаванне нацыянальнага адзінства".

Франко сцвярджаў, што Іспанія мае 2 мільёны салдат, гатовых „падтрымаць правы Іспаніі".

Патапленне падводнай лодкі

ЛОНДАН, 18 ліпеня (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што англійскія ваенна-паветраныя сілы патапілі ў паўднёвай частцы Атлантычнага акіяна непрыяцельскую падводную лодку.

Англа-французскія ўзаемаадносіны

ЛОНДАН, 18 ліпеня (ТАСС). Французскі ўрад назначыў Морана агентам па ліквідацыі эканамічных і гандлёвых пытанняў у Англіі. Англійскі ўрад назначыў агента, які будзе знаходзіцца на акупіраванай тэрыторыі Францыі.

Журналісцкія кругі расцэньваюць, што французскі ўрад у сучасны момант менш схільны парваць адносіны з Англіяй.

Рузвельт—кандыдат у прэзідэнты

НЬЮ ЙОРК, 18 ліпеня (ТАСС). З'езд дэмакратычнай партыі высунуў кандыдатам у прэзідэнты Рузвельта. Пры першай балатыроўцы Рузвельт з 1100 галасоў атрымаў 946.

Уручэнне вярыцельных грамат

СОФІЯ, 18 ліпеня (ТАСС). Сёння новы паўпрэд у Балгарыі тав. Лаўрышчэў уручыў цару Барысу свае вярыцельныя граматы.

Выступленне Сінклера

ЛОНДАН, 18 ліпеня (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Рэйтэр, міністр авіяцыі Сінклер заявіў, што з 1-га ліпеня збіта 105 германскіх самалётаў. Англійская авіяцыя страціла 24 самалёты.

Фінляндскі сейм зацвердзіў совецка-фінляндскі гандлёвы дагавор

ХЕЛЬСІНКІ, 17 ліпеня (ТАСС). Газета „Уусі суомі" піша, што на ўчарашнім пасяджэнні сейма ў другім абгаварванні зацверджан совецка-фінляндскі гандлёвы дагавор і пастанова ўрада аб уступленні ў сілу совецка-фінляндскага разлікавага дагавора.

Міністэрства замежных спраў Кітая аб англа-японскім пагадненні

ЧУНЦІН, 18 ліпеня (ТАСС). У сувязі з англа-японскім пагадненнем аб спыненні транзіта матэрыялаў праз Бірму ў Кітай міністэрства замежных спраў Кітая апублікавала заяву: „Кітайскі ўрад не можа не разглядваць гэтыя дзеянні англійскага ўрада як непрыязныя і незаконныя.

Зразумела, што перавозкі праз Бірму маюць велізарнае значэнне для барацьбы Кітая супроць агрэсіі. Прымаючы японскія патрабаванні, Англія дае вялікія перавагі агрэсару, дзеянні Англіі роўназначны дапамозе ворагу Кітая.

„Было-б вялікай памылкай,— гаворыцца ў заключэнні,—думаць, што Кітай пойдзе на мір. Мы будзем пры любых умовах прадаўжаць барацьбу".

Ваенныя дзеянні ў Кітаі

У Цэнтральным Кітаі

На паўночным усходзе правінцыі Чжэцзян прадаўжаюцца марскія аперацыі японцаў супроць кітайскіх партоў. Японскі ваенны карабль патоплен у вусці ракі Янцзы кітайскай берагавой батарэяй. Спробы японцаў высадзіць дэсант адбіты.

Японцы беспаспяхова спрабавалі фарсіраваць раку Цяньтан (на паўднёвы захад ад Ханчжоу).

Кітайскія войскі варваліся ў Сяошань (на ўсход ад Ханчжоу), дзе разгарнуліся вулічныя баі.

Звестак аб становішчы на іншых франтах няма.

* * *

У паветраным баі над Чунцінам 16 ліпеня збіта 3 японскіх бамбардыроўшчыкі.

18 ліпеня (ТАСС).

ПАПРАЎКА.

У газеце „Зара" за 19 ліпеня (№ 162) у інфармацыі, змешчанай на першай старонцы пад загалоўкам: „Вадатныя вынікі"—апошні абзац трэба чытаць так: „Сакратар Цэнтральнага Камітэта комуністычнай партыі Латвіі Спурэ..." і далей, як у тэксце.

Адказны рэдактар Г. Т. МІНЧУКОЎ.

адкрыты прыходныя касы Белкамунбанка

па прыёму ўсіх відаў плацяжоў ад насельніцтва г. Брэста за камунальныя паслугі, як та: квартплата, за сан. вчыстку, за ваду, абанэмэнтная плата за электраэнергію і радыё.

КАСЫ РАЗМЕШЧАНЫ:

1. Совецкая вул. д. № 87,
2. Пушкінская, „ „ 56,
3. Пр. 17 верасня „ 32,
4. Маскоўская вул. „ 41,
5. Вул. Перуца, „ 28.

Просьба да ўсіх грамадзян уносіць прыналежныя плацяжы ў вышэйуказаныя касы.

БЕЛКАМУНБАНК
Брэсцкае абласное аддзяленне.

Брэсцкаму абласному аддзяленню „Главуніверсам" **патрабуецца** на пастаянную работу **галоўны бухгалтар.** За даведкамі звяртацца па адрасу: **Брэст, Доўгая 10.**

Брэсцкаму Абласдрэўхімсаюзу тэрмінова **патрабуецца** на пастаянную работу **інжынер-будаўнік.** Звяртацца па адрасу: **Брэст, Гогаля 41.**

Згодна інструкцыі па размяшчэнню дзяржаўнай пазыкі сярод гарадскога і сельскага насельніцтва, за № 333-57 і 334-58 пункты 39 і 42, бухгалтэрыя кожнай установы і прадпрыемства і агенты раённых фінансавых аддзелаў абавязаны прадставіць

зводкі аб размяшчэнні ўсёй сумы падпіскі

па выпусках пазыкі і вартасці аблігацый па ф. 140 не позней 1 жніўня 1940 года.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ АШЧАДКАСА.

Што крыецца за агульнымі лічбамі

Старшыня арганізацыйнага бюро Абласдрэўхімсаюза таварыш Іванаў у сваім дакладзе на нарадзе старшынь арцеляў аб выніках работы Абласдрэўхімсаюза за верасень паўгоддзе адзначыў, што арцелямі саюза план быў выкананы на 100 процантаў. У словах дакладчыка гучала самазадавальненне.

Але давайце лепш прыглядзімся да лічбаў, заглянем у нутро работы саюза і пабачым, што-ж крыецца за гэтымі 100 процантамі, і тады стане ясна, што план па Абласдрэўхімсаюзу выканан толькі ўмарна на 100 процантаў, а шмат галіны вытворчасці, то тут паўстане зусім інакшая карціна. Выкананне плана па асноўнай галіне — лесахіміі складае толькі 30 процантаў гадавога плана. План вырабу мэблі таксама не выканан. Далёка яшчэ да выканання плана па лесапільнай, калі ўлічыць работу заводаў на давальскай сыравіне.

Пастае законнае пытанне: ці Абласдрэўхімсаюз выканаць дадзены план, ці меліся ў яго на гэта адпаведныя ўмовы? На гэта пытанне можна адказаць станоўча: умовы для работы прадпрыемстваў лесапільных, смалакурных, мэблёвых — былі і ёсць. Кожны лесапільны завод мацюць дастатковыя базы сырвы і ў неабходнай колькасці. Арцелі Лесдрэўхімсаюза затрымліваецца толькі адно — жаданне работаць і па-сапраўднаму дапамагаць справу ў арцелях, ліквідацыі абалёнку, пазбавіць работу аддзела забеспячэння, які несвоечасова загатаўляе неабходныя матэрыялы.

— Мы не можам вырабатываць коламазь, — гаворыць таварыш Падалінскі,—таму, што ў нас адсутнічае вапна. Нядаўна нам прыслалі вагон з непрыгоднай вапнай. Наша арцель выробляе гуталін для абутку, якога няма ва што расфасоўваць. Раней мы пакавалі яго ў вялікія каробкі, але гэта-ж здзекі над совецкім спажыўцом.

— У нас адсутнічае планавасць ў рабоце, пануе абязлічка, — гаварыў дырэктар завода „Бронная Гара" таварыш Мухаеў.—За кароткі час наш завод пераходзіў з аднаго водамства ў другое. Работаем мы без плана. У нас чамусьці заведзена, што план высылаецца заўсёды ў канцы квартала. Завод знаходзіцца ў цяжкіх фінансавых умовах. Замест тавараў, якія так неабходны для насельніцтва, нам загадваюць выробляць тару, на якую няма патрэбы. На маім заводзе ляжыць нерухома 24 тысячы штук яблычнай тары.

— Асноўнай прычынай невыканання планаў па нашых прадпрыемствах, — гаворыць таварыш Сілецкі з Івацэвіцкага завода,— з'яўляецца адсутнасць тэхнічнай вучобы і соцыялістычнага спаборніцтва паміж членамі арцеляў.

Аб гэтым-жа пытанні гаварылі і іншыя таварышы. Культурна-масавая работа амаль ва ўсіх арцелях запушчана, тут адсутнічаюць належныя кадры культработнікаў, якія ва многіх [illegible] у рабоце арцелі, мабілізоўваць [illegible] працоўную дысцыпліну, дабівацца поўнага выканання статута прамысловай арцелі.

Старшыні арцеляў у сваіх выступленнях дапоўнілі дакладчыка. Яны ўказалі на перашкоды, якія мае кожная арцель у сваёй рабоце, указалі на тое, што з абласнога цэнтра арцелямі не кіруюць і ў сваёй большасці яны прадастаўлены самі сабе.

Таварыш Кротаў з лесазавода „Октябрь" у сваім выступленні ўказаў наступнае: „Лесазавод план другога квартала выканаў на 50 процантаў. Прычына невыканання плана — незабяспечанасць завода сыравінай, цякучасць рабочай сілы. Для таго, каб забяспечыць завод сыравінай, патрэбна неадкладна паставіць пытанне аб арганізацыі транспарта, у якім адчуваецца такая патрэба. Цякучасць рабочай сілы тлумачыцца тым, што для рабочых не створаны ўмовы для жылля, дрэнна арганізавана забеспячэнне.

Оргбюро Абласдрэўхімсаюза канкрэтна не аказвае ніякай дапамогі нам у рабоце. Вось прыклад: прыслалі да нас з абласной канторы т. Бравермана для складання норм выпрацовак. Гэты так званы ўпаўнаважаны, седзячы ў кабінеце, складаў нормы і вынікам гэтага з'явілася тое, што нормы аказаліся завышанымі. Мы не выконваем плана выпрацоўкі мэблі таму, што не забяспечаны ў дастатковай колькасці піламатэрыялам".

Старшыня арцелі „Труд" таварыш Падалінскі падвёр крытыцы кааперыраваных саматужнікаў на выкананне вытворчых планаў.

Справядліва старшыня арцелі Тэненбаум (Кобрын) наракаў на раённыя арганізацыі, якія не толькі не дапамагаюць у рабоце арцелі, а перашкаджаюць. Для арцелі „Прагрэс" Кобрынскі райкамбінат не адпускае лесаматэрыял, гарадскі совет ніяк не падшукае памяшкання. У Кобрынскім горсавеце не раз заяўлялі таварышу Тэненбауму, каб ён закрыў арцель „моў райкамбінат сам справіцца". Такія-ж адносіны да арцелі і ў Высокім. Замест таго, каб дапамагчы арцелі ў вырабу мэблі, тавараў шырокага спажывання, кіраўнікі Высокаўскага раёна пераварылі мэблёвую арцель у рамонтную брыгаду па рамонту памяшканняў райвыканкома і іншых арганізацый.

Па дзелавому ўдзельнікі нарады намецілі канкрэтныя шляхі для паляпшэння работы прамысловых арцеляў па вырабу тавараў шырокага спажывання. У сістэме Лесдрэўхімсаюза, як підзе ўдзячная глеба для развіцця мясцовай прамысловасці. Умовы, рэсурсы, людзі ёсць, патрэбна толькі імі кіраваць. Заводы Лесдрэўхімсаюза і арцелі сумесна з вырабам мэблі могуць выробляць гонту штукатурную шчапу, драўляную посуду, тару пад гародніну, коламазь, масціку для падлог, калёсы, сані і іншыя. У рабоце арцеляў мясцовай кааперацыі павінны ўсямерную дапамогу аказаць абласныя арганізацыі, райкомы партыі і райвыканкомы.

Я. Зевацкі.

Адказны рэдактар [illegible] імені Карла Маркса 29. Тэлефоны 1—17, 1—26. Друкарня [illegible] Абліт